ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ СІСТЭМА ДЗЯРЖАЎНЫХ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК Г. МІНСКА

СЕКТАР ІНФАРМАЦЫЙНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ РАБОТЫ

# *Да 125-годдзя з дня нараджэння Міхася Лынькова*



*бібліяграфічны спіс*

Мінск 2024

## Прадмова

Нарадзіўся М. Лынькоў (Міхаіл Ціханавіч) 30.01.1899 г. ў вёсцы Зазыбы Віцебскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і чыгуначніка.

Скончыў Старасельскае народнае вучылішча, у 1917 г. — Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю. Настаўнічаў у Ліпініцкай земскай школе (цяпер Буда-Кашалёўскі раён). У 1919—1922 гг. служыў у Чырвонай Арміі. Удзельнічаў у савецка-польскай вайне, у разгроме атрадаў Булак-Балаховіча. Настаўнічаў у вёсцы Свержань Рагачоўскага раёна. У 1925—1928 гг. — адказны сакратар рэдакцыі, намеснік рэдактара, у 1928—1930 гг. — рэдактар бабруйскай акруговай газеты «Камуніст». Быў арганізатарам і кіраўніком Бабруйскай філіі «Маладняка», адным з кіраўнікоў БелАПП. Працаваў у Дзяржаўным выдавецтве БССР (1930—1932), сакратаром аргкамітэта (1932—1934), галоўным рэдактарам часопіса «Полымя рэвалюцыі» (1933—1941), старшынёй праўлення СП БССР (1938—1948). Удзельнік паходу ў Заходнюю Беларусь у 1939 г. (рэдагаваў газету «Беларуская звязда» — палітупраўлення Беларускага фронту). У 1941—1942 гг. рэдактар франтавой газеты «За Савецкую Беларусь» (выходзіла на Заходнім Цэнтральным і Бранскім франтах). У 1943—1946 і 1949—1952 гг. — дырэктар Інстытута літаратуры і мастацтва АН БССР. Абіраўся кандыдатам у члены ЦВК БССР (1921—1931), дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1940—1945). Як член дэлегацыі БССР неаднаразова ўдзельнічаў у рабоце сесій Генеральнай Асамблеі ААН. Акадэмік АН БССР. Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны трыма ордэнамі Леніна, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі.

Народны пісьменнік БССР (1962).

Памёр 21.09.1975 г.

Першы твор (верш) надрукаваў у 1919 г. (смаленская газета «Борьба»), першыя апавяданні — у 1926 г. (бабруйская газета «Камуніст» і зборнік бабруйскай філіі «Маладняка» — «Уздым». Выйшлі зборнікі прозы «Апавяданні» (1927), «Гой» (1929), «Андрэй Лятун» (1930), «Саўка-агіцірнік» (1933), «На вялікай хвалі» (1934), «Баян» (1935), «Сустрэчы» (1940), «Астап» (1944), «Апошні зверыядавец» (аповесць, 1930), «За акіянам» (нататкі, апавяданні, нарысы, 1962), раман «На чырвоных лядах» (1934) і раман-эпапея ў 4 кнігах «Векапомныя дні» (1958, 2-е перапрацаванае выданне ў 1969), нарыс «Герой Савецкага Саюза Канстанцін Заслонаў» (1944), апавяданне «Агні Танганьікі» (1957), «Выбраныя творы» (1931, 1934, 1952), «Выбраныя апавяданні» (1938, 1941, 1947), Зборы твораў у 4-х (1967—1968) і ў 8 тамах (1981—1985).

Для дзяцей выдадзены кнігі. «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» (1937), «Міколка-паравоз» (1937, аповесць экранізавана ў 1957), «Янка-парашутыст» (1937), «Ядвісін дуб» (1940), «Апавяданні» (1946, 1948, 1960, 1966, 1973, 1974, 1988).

М. Лынькову належаць літаратуразнаўчыя працы «Беларуская літаратура за 30 год» (1948, на беларускай і рускай мовах), «Вобраз Сталіна ў беларускай мастацкай літаратуры (1950), «Якуб Колас» (1952), «Летапіс эпохі: Беларускай савецкай літаратуры пяцьдзесят год» (1968), зборнік артыкулаў «Літаратура і жыццё» (1978), кніга «Публіцыстыка» (1980).

Пераклаў на беларускую мову асобныя творы М. Горкага, М. Ціханава і інш.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1968) за раман «Векапомныя дні»

Бібліяграфічны спіс «Міхась Лынькоў. Да 125-годдзя з дня нараджэння» пазнаёміць з матэрыяламі аб жыцці і творчасці пісьменніка, якія знаходзяцца ў фондах дзяржаўнай установы «Цэнтралізаваная сістэма публічных бібліятэк г. Мінска». Паказальнік змяшчае кнігі, артыкулы з перыядычных выданняў, мае тры раздзелы: «Творы М. Лынькова», «Творы М. Лынькова ў зборніках», «Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка». Размяшчэнне матэрыяла: кнігі — у алфавіце, артыкулы — у зваротна-

храналагічным парадку. Бібліяграфічны паказальнік будзе карысны ўсім, хто цікавіцца беларускай літаратурай і творчасцю пісьменніка.

**Змест**
**Творы М. Лынькова**
**Творы М. Лынькова ў зборніках**
**Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка**

## Творы М. Лынькова

**Лынькоў, М. Ц.** Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў : аповесць : [для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту] / Міхась Лынькоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2023. — 61 с.

**Лынькоў, М.** Міколка-паравоз : аповесць / Міхась Лынькоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2021. — 123, [2] с.

**Лынькоў, М.** Творы / Міхась Лынькоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2017. — 676, [2] с. — (Залатая калекцыя беларускай літаратуры ; т. 14).

***змест***

## Творы М. Лынькова ў зборніках

**Беларуская проза даваеннага перыяду** : [для старэйшага школьнага ўзросту / рэдактар А. В. Малішэўская]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2023. — 301, [2] с.
*Апавяданні М. Лынькова “Над Бугам”на с. 3—12, “Васількі”на с. 13—25.*

**Беларусь — мая Радзіма** : вершы, апавяданні, нарысы : [творы беларускіх паэтаў і празаікаў / укладальнік А. Бадак]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2023. — 134, [1] с.
*Апавяданне М. Лынькова “Васількі”на с. 55—63.*

**Валошка і васілёк** : творы пра кветку, якая любіць жытнёвае мора : [для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / укладальніца А. В. Спрынчан. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2020. — 79 с.
*Апавяданне М. Лынькова “Васількі”на с. 185—191.*

**І памяць гаворыць** : зборнік твораў для дадатковага чытання ў 10 класе / [складальнік С. І. Моўчан]. — Мінск : Беларусь, 2023. — 278, [1] с.
*Апавяданні М. Лынькова “Васількі”на с. 29—39, “Дзіцячы башмачок” на с. 192—197, “Кавалак хлеба”на с. 198—203, “Астап”на с. 203—214.*

**Лясная гісторыя** : 25 апавяданняў пра прыроду / [укладальнік А. Бадак]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2021. — 308, [2] с.
*Апавяданне М. Лынькова “Воўчы лог”на с. 136.—144.*

**Помнік герою** : творы пра Вялікую Айчынную вайну : [для дзяцей малодшага школьнага ўзросту / укладальнік В. Шніп]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2023. — 245, [1] с.
*Апавяданне М. Лынькова “Васількі”на с. 96.—103.*

**Усе колеры года** : казкі, вершы, апавяданні : [для дзяцей малодшага школьнага ўзросту / укладальнік А. Бадак ; ілюстрацыі Ю. М. Сумаравай]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2024. — 168, [7] с. — (Бібліятэка пачатковай школы).

**Хлопцы самай вялікай вайны** : 25 апавяданняў пра Вялікую Айчынную вайну / [укладальнік А. Бадак]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2022. — 341, [2] с.

*Апавяданні М. Лынькова "Васількі" на с. 5—12, "Астап" на с. 14—25.*

[змест](#)

## Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка

**Лынькоў, Міхась** // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя : [у 12 т.] / рэдкалегія: П. У. Броўка (галоўны рэадактар) [і інш.]. — Мінск, 1972. — Т. 6. — С. 449—450.

**Лынькоў, Міхась** // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / [пад рэдакцыяй прафесара А. В. Мальдзіса]. — Мінск, 1994. — Т. 4. — С. 117—130.

**Лынькоў, Міхась** // Беларускія пісьменнікі (1917—1990) : даведнік / [складальнік А. К. Гардзіцкі ; навуковы рэдактар А. Л. Верабей]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. — С. 348—349.

**Лынькоў, Міхась** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкалегія: Г. П. Пашкоў (галоўны рэдактар) [і інш.]. — Мінск, 1999. — Т. 9. — С. 383.

**Лынькоў, Міхась** // Культура Беларусі : энцыклапедыя: [у 6 т.] / рэдкалегія: В. В. Калістратава (галоўны рэдактар) [і інш.]. — Мінск, 2014. — Т 5. — С. 171.

**Лынькоў, Міхась** // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкалегія: І. П. Шамякін (галоўны рэдактар) і інш. — Мінск, 1986. — Т. 3. — С. 310—311.

**Лыньков, Михась** // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / [редколлегия: Т. В. Белова (главный редактор) и др.]. — Минск, 2011. — Т. 2: в 2 кн., кн. 2. — С. 91—92.

**Лыньков, Михась** // Республика Беларусь : энциклопедия: [в 6 т.] / редколлегия: Г. П. Пашков (главный редактор [и др.]. — Минск : Беларуская Энцыклапедыя, 2007. — Т. 4. — С. 575.

**Святло яго душы** : успаміны пра Міхася Лынькова / [складальнікі: С. Лынькова-Куспіц, Ю. Пшыркоў]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1979. — 368 с.

*****

**Трус, М. В.** Духоўная трываласць і творчае пакліканне / Мікола Трус // Маладосць. — 2023. — № 6. — С. 105—108.

*Літаратурная творчасць беларускіх пісьменнікаў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку і М. Лынькова.*

**Макаранка, Т.** Паэт вачамі фатографа Міхася Лынькова / Таццяна Макаранка // Роднае слова. — 2021. — № 10. — С. 11.

*Прыведзены звесткі пра сяброўскія стасункі паміж Я. Коласам і М. Лыньковым, які захапляўся фотамастацтвам і пакінуў у спадчыну шмат фотавыяў Песняра.*

**Кісель, І.** У імя дабра і справядлівасці : літаратурная гасцёўня для 7—9 класаў па творчасці Міхася Лынькова / І. Кісель // Бібліятэка прапануе. — 2020. — № 7. — С. 20—23.

**Ганчарова-Цынкевіч, Т. У.** Рамантыка-рэвалюцыйная героіка апавяданняў Міхася Лынькова : да 120-годдзя з дня нараджэння / Таццяна Ганчарова-Цынкевіч // Роднае слова. — 2019. — № 11. — С. 3—6.

**Павільч, А. А.** Міжкультурныя адрозненні ў бязмежжы культурнай разнастайнасці: тэарэтычныя меркаванні і жыццёвая праўда / Аляксандр Павільч // Роднае слова. — 2015. — № 7. — С. 81—84.

***зместа***